*Аляксей Хадыка*

# Вандроўкі па ваколіцах мінулага

У напісаных 155 год таму ў нарысах "Вандроўкі па маіх былых ваколіцах" (1853) паэт Уладзіслаў Сыракомля (Кандратовіч, 1823—1862) паказаў сябе як сапраўдны краязнаўца і выдатны спецыяліст у інтэлектуальных плынях і вучэннях позняга рамантызму, датычных да гісторыі мастацтва і архітэктуры.

І ў гэтым імкненні Сыракомля наследаваў працы як літаратараў, так і "вузкіх" спецыялістаў – гісторыкаў культуры Заходняй Еўропы. Так, яшчэ Гётэ паклаў асновы эстэтычна завостранага вывучэння нацыянальнага духу і стылю ў мастацтве – у 1772 г. ён надрукаваў працу "Пра нямецкую архітэктуру", імкнучыся прыпісаць вынаходніцтва готыкі генію нямецкага народа. А больш навуковыя і дакладныя даследванні нацыянальных архітэктурных форм увогуле ўзніклі ў часы, калі пісаў сам Сыракомля. Прыкладам, з 1854 па 1868 гг. знакаміты архітэктар і гісторык француз Віяле-ле-Дзюк, які праславіўся рэстаўрацыяй сабора Парыжскай Божай Маці (1845), апублікаваў свой "Слоўнік французскай архітэктуры з XI па XVI ст." І напісанне Віктарам Гюго "Сабора Парыжскай Божай Маці" (1831) – літаратурнай рэстаўрацыі славутага гатычнага помніка – было блізкім па часе. Адным словам, дух готыкі захапляў розум інтэлектуалаў таго часу.

Пра Мірскі замак Сыракомля ў сваіх "Вандроўках..." напісаў падрабязна, падыходзячы да высноў толькі пасля агульнага аналізу развіцця архітэктурных стыляў з экскурсам ажно ў антычнасць і адсылкамі ў ранняе сярэднявечча. Яго канчатковая выснова: "Гэта, як бачым, гатычная пабу-

дова; яшчэ ў ёй праглядваецца нешта феадальнае, часы сярэднявечча, але відаць ужо ўплыў італьянскага густу, які ў XVI ст. адбіўся ў нас на ўсіх творах мастацтва. Бо дойлідства, як і літаратура, добра адлюстроўвае думку кожнага народа і часу". Як тут не заўважыць, што Сыракомля на 70 год раней класіка беларускага мастацтвазнаўства Міколы Шчакаціхіна зрабіў дакладную выснову пра XVI ст. як час пераходу ад готыкі да рэнесансу ў беларускай культуры! Дакладнасці назіранняў паэта не перашкаджае рамантычны стыль выкладання: "Выгляд гатычных муроў з іх высокімі вежамі, што сягаюць аж у хмары, як бы хоча сказаць: з нябёс бяруць Яго пасланнікі сваю грозную зямную сілу".

Цалкам заканамерна, што Мірскі замак, своеасаблівы сімвал архітэктурнай спадчыны Беларусі, зрабіўся аб'ектам мастацкай цікавасці яшчэ аднаго рамантыка, Напалеона Орды (1807-1883), паўстанца 1831 г., піяніста, кампазітара, мастака. Лёс Орды быў папросту фантастычна цікавы – знаходзячыся ў эміграцыі па паўстанні 1831 г. у Францыі, ён бываў у Адама Міцкевіча, сябраваў з Фрыдэрыкам Шапэнам. Некаторыя п'есы для фартэпіяна, паланэзы Шапэна і Орды вельмі падобныя. Нарэшце, Орда вучыўся малюнку ў знакамітага французскага акварэліста П'ера Жырара (1806—1872). Вярнуўшыся з эміграцыі пасля абвешчанай Аляксандрам II для паўстанцаў 1831 г. амністыі 1856 г., Орда з 1860 г. пачаў вандраваць па землях былой Рэчы Паспалітай. Алоўкам, сепіяй і акварэллю ён рабіў замалёўкі гарадоў і вёсак, замкаў, палацаў, магнацкіх і шляхецкіх рэзідэнцый Беларусі, выязджаючы са сваёй сядзібы ў Варацэвічах на Янаўшчыне, Орда прысвяціў больш за 200 малюнкаў з агульнай колькасці ў тысячу. Збор іх арыгіналаў, падараваны беларускай магнаткай Канстанцыяй Скірмунт Нацыянальнаму музею ў Кракаве – далей ад Расіі, – захоўваецца там і зараз. Маці Канстанцыі,

Алена Скірмунт, пляменніца Орды, была першай жанчынай-скульптарам у Беларусі (Распяцце яе работы знаходзіцца ў касцёле ў Янаве Палесскім пад Пінскам па сённяшні дзень). Між іншых прац скульптарка выканала партрэтны барэльеф іхняга агульнага з Ордам сваяка, пісьменніка Юзэфа Ігнацыя Крашэўскага. Крашэўскі вельмі захапляўся малюнкамі Орды, пішучы да апошняга ў лісце ад 16 красавіка 1875 г.: " Зборнік гэты бясцэнны, а гэтак багаты, што трэба ўразіцца, што Вы яго без чужой дапамогі, сваімі сіламі здолелі выдаць..." Гутарка ішла ўжо пра літаграфічнае выданне ў варшаўскай майстэрні Максіміліяна Фаянса, якое ахапіла 260 малюнкаў, пераведзеных у літаграфіі ў 8 серыях, што з'явіліся з 1875 па 1883 г..

Прапануем чытачу зірнуць на рэдкі прыклад – акварэль Мірскага замка з кракаўскай калекцыі, адбіткі з якой



*Малюнак 1.*




Малюнак 2.



Малюнак 3.

з’явіліся ў Беларусі толькі ў 2008 г.. (мал.1.) А яшчэ дададзім графічную выяву з падобным відам з тагачаснага часопіса “Tygodnik Ilustrowany”. (мал.2.) Працы Орды цалкам могуць спатрэбіцца пры музеефікацыі Мірскага замка – чаму б не зрабіць у ім літаратурна-мастацкія пакоі, прысвечаныя Уладзіславу Сыракомлі, Напалеону Ордзе і іншым творцам беларускай і польскай культуры, якія ўславілі мастацкі геній нашага краю ў яго старадаўніх помніках – у Міры і блізкіх ці болей далёкіх ваколіцах? Копіі акварэляў, літаграфіі Орды – чым не адпаведнае напаўненне для замкавых інтэр’ераў? А некаторыя малюнкі майстра могуць паслужыць і для практычнага аднаўлення інтэр’ераў у стылі XIX ст.: Орда, арыштаваны ў Гродне ў 1863 г. у сувязі з падазрэннем у сімпатыях і дапамозе ўдзельнікам чарговага нацыянальна-вызваленчага паўстання ў Беларусі, пакінуў замалёўкі інтэр’ераў, дзе зму-



*Малюнак 4.*

шана бавіў час. Прывядзем малюнак палаца, дзе Орда адбыў яшчэ адно кароткае затрыманне – у Кобрыне ў 1866 г. Тут можна ўжо бачыць дэталі – ад мэблі і посуду на стале, да “слюсарскай работы” – перапляценняў рамы на вакне, засаўкі і ручкі на дзьвярах. Чым не дапаможнік рэстаўратарам і музейшчыкам у планаванні ордаўскіх мемарыяльных пакояў? (мал.3,4.)

“Вялікая хроніка, якая ахоплівае столькі стагоддзяў, згаданых вопытным алоўкам мастака,” – сказаў пра альбомы Орды адзін з сучаснікаў. Варта ўважлівей глядзець на старыя малюнкі і гравюры – і тады не ўзнікнуць у інтэр’ерах замка псеўдагістарычныя печы, а ў родавую царкву-пахавальню Святаполк-Мірскіх, побач з замкам, не будзе ахвоты ставіць пластыкава-шкляныя “еўрадзьверы”.